# *ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ*

**УДК 82.091**

## «ПОМНІК» ГАРАЦЫЯ ЯК ФЕНОМЕН БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***канд. філал. навук, дац. Н.В. НЕСЦЕР***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***n.nester@psu.by***

*Ода Гарацыя (65–8 гг. да н.э.) «Да Мельпамены» (Ad Melpomĕnem) у гісторыі беларускай літаратуры – з'ява адначасова знаёмая і ў той жа час недастаткова даследаваная, дагэтуль прадстаўляе інтарэс для літаратуразнаўцаў. Гэты твор Гарацыя даў пачатак новаму паэтычнаму жанру – «помніку», у якім аўтар часткова бэрэ за аснову кампазіцыю оды Гарацыя і яе першы радок «Exegi monumentum aere perennius», апавядае пра свае заслугі перад паэзіяй і новаўвядзенні, якія павінны захавацца ў нашчадкаў і абессмяроціць яго імя. Але сярод іншых вершаў-«Помнікаў» у рымскай літаратуры, менавіта ода Гарацыя валодае аўтарскім індывідуалізмам і асэнсаваннем сваёй «асабістай» паэтычнай бессмяротнасці, у ім распрацоўваецца матыў спаборніцтва паэтычнага «Помніка» з гістарычным (пірамiды) і прыродным (стыхіі) часам, з вечнасцю. Гэты матыў стаў агульным месцам многіх «Помнікаў», прычым кожны наступны варыянт гэтай жанравай формы пачынае канкурыраваць з папярэднім, а, значыць, апасродкавана, – і з Гарацыем. Даследуюцца творы М. Багдановіча «Памятнік», У. Жылкі «Прыкладзіны», А. Хадановіча «Да Мельпамены», «Насьледаванне Гарацыю», С. Мінскевіча «Помнік з гукавым афармоленнем», А. Міцкевіча «Exegi munimentum aere perennius…», А.Ф. Брыля «Да Мельпамены». Адзначаецца, што айчынныя паэты звяртаюцца да «Помніка» Гарацыя, ствараюць пераклады, пераклады-пералажэнні, пералажэнні-пародыі, што ў беларускім кантэксце тэма «Помніка» набывае спецыфічныя нацыянальныя характарыстыкі.*

***Ключавыя словы:*** *помнік, Мельпамена, пераклад, пералажэнне, варыяцыя, пародыя, іронія, пераасэнсаванне, трансфармацыя.*

**Уводзіны**. Знакамітая трыццатая ода «Да Мельпамены»[1], якой Гарацый скончыў трэцюю кнігу од (*Carm. III, 30*) і збіраўся падвесці вынікі сваёй паэтычнай творчасці цалкам, – адзін з тых выпадкаў, калі самаўсведамленне паэта знаходзіць асабліва важкія, сціслыя, істотныя словы для таго, каб выразіць сябе. У гэтым творы рымскі паэт сцвярджае: лепшае, што ў ім ёсць, не памрэ, што яго слава будзе жыць вечна. Таксама ён спрабуе акрэсліць той арэал, дзе будуць памятаць пра яго, – будучую краіну сваёй паэтычнай славы. У одзе згадваецца Апулія, адкуль паходзіў Гарацый, – мясціны, дзе грукоча рака Аўфід, і дзе ўладарыў вясковым народам Даўн. Гарацый звяртаецца да старажытнай гісторыі Апуліі – і яго паэтычная слава набывае гістарычную працягласць. Гарацый лічыў свой паэтычны шлях закончаным, а паэзію не патрэбнай для далейшага жыцця. Але, нягледзячы на гэта, цэнтрам оды з'яўляецца не столькі аўтар, сколькі створаныя шматгадовай працай творы, якія Гарацый малюе ў выглядзе масіўнага помніка. «Перавага» помніка заключаецца ў манументальнасці – ён «вышэйшы за піраміды», якія з'яўляюцца сімвалам бясконцага быцця і бессмяротнасці:

Exegi monument(um) aere perennius
Regalique situ pyramid(um) altius,
Quod non imber edax, non Aquil(o)[2] impotens
Possit diruer(e) aut innumerabilis
Annorum series et fuga temporum
Non omnis moriar, multaque pars mei
Vitabit Libitin(am)[3]; usqu(e) ego postera
Crescam laud(e) recens dum Capitolium[4]
Scandet cum tacita virgine pontifex[5].
Dicar, qua violens obstrepit Aufidus[6]

[1] Мельпамена традыцыйна лічыцца музай трагедыі, але першапачаткова ўспрымалася як муза песні наогул.
Ода напісана першай Асклепіядавай страфой, якая, у сваю чаргу, складаецца з чатырох Асклепіядавых вершаў. Гэты верш з'яўляецца па сутнасці мадыфікацыяй пентаметра, у якім першая и перадапошняя дактылічныя стопы ўсечаны на адзін кароткі склад.
[2] I Aquilo (=Boreas) Аквілон, бог паўночнага ветра, муж Арыфіі, насельнік/жыхар пячоры Гема (Гем – сын Барэя і Арыфіі, які быў ператвораны ў гару; горны ланцужок у паўночнай Македоніі і Фракіі (сучасныя Балканы).
II aquilo – 1) *pl.* паўночны вецер, аквілон; 2) поўнач.
[3] Libitina – Лібіціна, багіня памерлых, смерці і пахавання; *перан.*: 1) пахаванне; 2) пахавальнае вогнішча; 3) смерць.
[4] Capitolium – Капітолій: 1) вышэйшае месца Капіталійскага ўзгорка ў Рыме, да захада ад форума, з храмамі Юпітэра і Мінервы; 2) у шырокім сэнсе – увесь Капіталійскі ўзгорак.
[5] pontĭfex – пантыфік, жрэц.

Et qua pauper aquae Daunus[7] agrestium
Regnavit populor(um), ex humili potens,
Princeps Aeolium[8] carmen ad Italos
Deduxisse modos. Sume superbiam
Quaesitam meritis et mihi Delphica[9]
Lauro cinge volens, Melpomĕne[10], comam[11] [11, с. 82].

Гарацый ганарліва гаворыць пра сваё месца ў стагоддзях: пакуль стаіць Рым (а для рымляніна гэта значыць – пакуль стаіць свет), паэту наканавана «павялічваць» (*crescĕre*) сваю славу. Але ўзнікае пытанне, чым ён заслужыў такі гонар, чаму помнік, які ён сам сабе збудаваў, больш даўгавечны, чым медзь, і вышэй пірамід? Узгадваецца толькі ўнутрылітаратурнае, прафесійнае дасягненне, і прытым такой уласцівасці, што ім падкрэслена так званая «другаснасць» Гарацыя і ўсёй рымскай літаратуры наогул, іх залежнасць ад грэчаскай меры: «*Princeps Aeolium*[12] *carmen ad Italos / Deduxisse modos*». У самым высокаўрачыстым кантэксце Гарацый хваліцца тым, што ўпершыню прыўнёс у склад рымскай паэтычнай практыкі традыцыю, якая бярэ пачатак у творчасці старажытных эалійскіх лірыкаў Алкея і Сапфо, толькі гэтым і нічым іншым. У гэтым рымскі паэт бачыць ні многа ні мала залог сваёй бессмяротнасці.

У гэтым сэнсе «помнікам» можна назваць і заключныя радкі паэмы Авідзія (43 г. да н.э. – 18 г. н.э.) «Ператварэнні» (XV, 871–879), якія выконваюць функцыю так званага «апошняга твора»[13]; і фрагмент з паэмы «Георгікі» Вергілія (70–19 гг. да н.э.), дзе паэт звяртаецца да тэмы «паэтычнай бессмяротнасці»[14]. Рымскі паэт гаворыць і пра свае заслугі, і пра ўзнагароды, якія ён павінен атрымаць: «Я между тем, увенчав чело свое ветвью оливы / Буду дары приносить … славить сраженья / Цезаря, имя его пронесу через столькие годы / Сколькими сам отделен от рожденья Тифонова Цезарь» [7, с. 9]. Праперцый (49–15 гг. да н.э.) таксама развівае тэму «неўміручай славы паэта» у першай[15] і другой элегіях трэцяй кнігі, а таксама абгрунтоўвае, чым ён заслужыў гэту славу: «Каждая песня моя – памятник вечной красе» [14, с. 365]. Праперцый гаворыць пра неўміручасць сваёй славы, параўноўвае яе з «храмам Юпітэра», са «склепам Маўзола»[16].

**Асноўная частка.** Гарацый з самага пачатку знайшоў дастойнае месца сярод антычных паэтаў, да якіх звярталіся беларускія аўтары. У Мінску ў 1909 годзе ў серыі «Бібліятэка ‘Капітолій’» быў апублікаваны «Скандоўнік» (дапаможнік для правільнага чытання лацінскіх вершаў) да выбраных одаў і эподаў Гарацыя. Творы Гарацыя на беларускую мову перакладалі М. Багдановіч («Памятнік»)[17], А. Жлутка («Да Мецэната», «Да Ліцынія Мурэны», «Да Леўканоі»)[18], А. Хадановіч («Ода да Мецэната»[19], «Да Мельпамены»[20]), А.Ф. Брыль («Да Агрыпы» (I, 6), «Да Леўканоі» (I, 11), «Да Хлоі» (I, 23), «Да Ліцынія Мурэны» (II, 10), «Размова з Лідыяй» (III, 9), «Да Элія Ламіі» (III, 17))[21] і інш.

---

[6] Aufĭdus – Аўфід, галоўная рака ў Апуліі.
[7] Daunus – Даўн, міфічны цар паўночный Апуліі (Даўніі), сын Пілумна і Данаі, бацька (ці продак) Турна.
[8] Aeolium – эалійскі (Эаліда – вобласць на заходнім узбярэжжы М. Азіі).
[9] Delphĭca – дэльфійскі (Дэльфы – горад у Факідзе ў падэшвы Парнаса; месцазнаходжанне аракула Апалона; па ўяўленню грэкаў, цэнтр зямлі).
[10] Melpomĕne (грэч. «якая спявае») – Мельпамена, муза трагедыі і лірычнай паэзіі.
[11] Я помнік збудаваў больш даўгавечны, чым медзь / Вышэйшы за царскі будынак пірамід, / Які ні згубны лівень, ні люты Аквілон / Не зможа разбурыць, ні незлічымы / Рад гадоў і бег часоў / Не ўвесь я памру, большая частка мяне / Пазбегне Лібіціны; да той пары, пакуль я / Не павялічу далейшай славы, пакуль на Капітолій / Будзе падымацца пантыфік з маўклівай дзевай. / Буду казаць, дзе шуміць бурны Аўфід / І дзе бедны вадой Даўн сельскімі / Правіў народамі, які ўзняўся з нізоў, / Першы эалійскую паэзію на італійскія / Лады я перанёс. Напоўнюся гордасцю / Заслужана набытай і мне дэльфійскім / Лаўрам увянчай міласціва, Мельпамена, валасы (*Пераклад наш. – Н. Несцер*).
[12] Aeolium – эалійскі (Эаліда – вобласць на заходнім узбярэжжы М. Азіі).
[13] Вот завершился мой труд, и его ни Юпитера злоба / Не уничтожит, ни меч, ни огонь, ни алчная старость. / Пусть же тот день прилетит, что над плотью одной возымеет / Власть, для меня завершить неверной течение жизни. / Лучшей частью своей, вековечен, к светилам высоким / Я вознесусь, и мое нерушимо останется имя. / Всюду меня на земле, где б власть ни раскинулась Рима, / Будут народы читать, и на вечные веки, во славе –/ Ежели только певцов предчувствиям верить – пребуду [18, с. 344].
[14] Ввысь подымусь и людские уста облечу, торжествуя! / Первым на родину я – лишь бы жизни достало! – с собою / Милых мне Муз приведу, возвратясь с Аонийской вершины. / Первый тебе принесу идумейские, Мантуя, пальмы; / Там на зеленом лугу из мрамора храм я воздвигну / Возле воды, где, лениво виясь, блуждает широкий / Минций, прибрежья свои тростником скрывающий мягким. / Цезарь будет стоять в середине хозяином храма [7, с. 9].
[15] Пусть же стремится мой стих, тонкою пемзой лощен, –/ С ним меня слава взовьет над землей, и рожденная мною / Муза воздвигнет триумф в беге венчанных коней, / И в колеснице моей молодые помчатся амуры, / Той же дорогой вослед хлынут поэты толпой. / Что вам, бразды отпустив, со мной состязаться напрасно? / Нам ведь просторным путем к музам идти не дано [14, с. 363–364].
[16] Или потоки дождей, иль пламя лишит их величья, / Или под тяжестью лет сами, сломившись, падут. / Но не погибнет в веках талантом добытое имя: / Слава таланта и блеск вечным бессмертьем горят [14, с. 366].
[17] Галасы з-за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах ХХ ст. / склад. М. Скобла ; уступны артыкул Е. Лявонавай, навук. рэд. Л. Баршчэўскі. – Мінск : Лімарыус, 2008. – С. 42–43.
[18] «Тутэйшыя»: Творчасць сяброў таварыства / уклад. С. Дубаўца. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 121–123.
[19] Хадановіч, А. Разам з пылам: калекцыя перакладаў / А. Хадановіч. – Мінск : Кнігазбор, 2013. – С. 4.
[20] Хадановіч, А. «Засьпетыя на Гарацым. Тры стратэгіі будаўніцтва «Помнікаў» (Пушкін, Міцкевіч, Бадлер ды іншыя)» / А. Хадановіч // Arche-Skaryna. – 2001. – № 3 (17). – С. 73.
[21] Брыль, А. Ф. Квінт Гарацый Флак. Легкадумны заўсёды я. Выбраныя оды / А. Ф. Брыль // Рэжым доступа: http://prajdzisvet.org/kit/108-liehkadumny-zausiody-ja.html. – Дата доступа: 20.04.2015.

Ідэя «Помніка» была вельмі блізкай беларускім паэтам і актыўна распрацоўвалася рознымі аўтарамі. Адным з першых перакладчыкаў оды «Да Мельпамены» быў М. Багдановіч (1891–1917), мастацкія пошукі якога пралягалі ў русле агульнага працэсу сусветных літаратур, што давала магчымасць паказаць эстэтычную значнасць беларускай літаратуры, увесці яе «ў еўрапейскі і сусветны кантэкст, сцвердзіць яе як з’яву агульнаеўрапейскага парадку, а не толькі «лакальную», «мясцовую»; праз далучэнне да скарбніцы сусветнай культуры адкрыць тыя схаваныя скарбы, якія ёсць у нацыянальнай мове і культуры» [26, с. 507–508]. Оду Гарацыя «Да Мельпамены» беларускі паэт пераклаў блізка да лацінскага арыгінала і перадаў пры гэтым яго памер, невядомы датуль у беларускай паэзіі, – асклепіадаўскі верш. У паэтычным перакладзе М. Багдановіча паслядоўна ўжываецца мужчынскі канчатак:

Лепшы медзі сабе памятнік справіў я,
Болей усіх пірамід царскіх падняўся ён;
Не зруйнуе яго сівер, ні едкі дождж,
Ні гадоў чарада, вечнага часу рух.
Не саўсім я памру, лепшая часць мяне
Не зазнае хаўтур; слава мая ўвесь час
Між патомкаў расці будзе, пакуль ўсхадзіць
Зможа з дзевай удвух на Капітоліі жрэц.
Аба мне гаварыць будуць: «Раджоны там,
Дзе шумлівы Аўфід шпарка ў палях імкне,
Дзе царыць над людзьмі бедны вадой Танай, –
Ён да славы дайшоў, хоць і не панам быў».
Першы стаў я складаць на эолійскі лад
Ў нашым родным краю песні пад мірны звон.
Ўсе заслугі мае, муза, з пашанай зліг
І лаўровым вянком мне валасы пакрой [8, с. 42–43].

Сваім перакладам М. Багдановіч адзначае, што лепш пражыць кароткае, яркае жыццё і пакінуць пасля сябе след у памяці людзей, чым весці доўгую шэрую нітку жыцця. Наогул, у перакладах ён прытрымліваўся пушкінскага прынцыпу творчых адносін да арыгінала, захавання яго ідэйных і мастацкіх вартасцей нацыянальнага каларыту, паэтычнага стылю. Сам паэт абвяшчае пра пастаўлены сабе помнік, пра славу, якая будзе расці паміж нашчадкаў, пра людзей, якія будуць гаварыць аб ім.

Пералажэнне славутай оды Гарацыя «Да Мельпамены» належыць Ул. Жылке (1900–1933). Яго верш «Прыкладзіны» ўпершыню быў надрукаваны ў часопісе «Сакавік» (1948, № 1). Гэты твор з надпісам «Перайманне Гарацыя» вызначаецца нацыянальна-вызваленчай праблематыкай:

Паставіў я сабе прыклад навек трывалы,
Выносісты вышэй за валатовак вал,
Не скрышаць мне яго ні ўлевы, ні навалы,
Ні часу, дзён і год бурлівы перавал... [12, с. 124].

У вершы адчуваюцца тыя ж самыя матывы неўміручай славы паэта. Аўтар заяўляе, што сам сабе паставіў «прыклад», які, як і «помнік», у папярэдніх перакладах оды, з’яўляецца нерушымым. Паэт не збіраецца паміраць у сэрцах беларускага народа. Ён хоча застацца ў іх памяці жывым, жыць вечна. Аўтар верыць, што памяць аб ім будзе да тых пор пакуль «Пагоні меч зіхціць на Вострай Браме / І рух нясе наш бел-чырвона-белы сцяг» [12, с. 124]. У канцы верша У. Жылка звяртаецца не да «Мельпамены», а да «сялянскай Купалкі», якую просіць узнагародзіць яго валошкавым вянком.

А. Хадановіч зрабіў пераклад «Помніка» Гарацыя, які атрымаўся вельмі падобным да варыянта М. Багдановіча. У першым радку паэт абвяшчае, што збудаваў помнік, які «трывалейшы за медзь / высачэйшы за высь велічных пірамід», які не зруйнуюць «Ні навалы залеў, ні Аквілёна моц / … ані бясконцы бег / Незлічоных гадоў, хуткага часу плынь!» [23, с. 42]. Паэт упэўнены, што:

Бо ня цалкам памру! Лепшае, што ў ва мне,
Не спазнае труны: слава мая расці
Вечна будзе паміж спадчыннікаў... [23, с. 42]

Аўтар ўзгадвае рымскія рэаліі «Капітоль», «Аквілон», «Даўн», «Аўфід», «Мельпамену», якія прысутнічаюць і ў творы Гарацыя. У канцы верша звяртаецца да свайго народа, каб той ганарыўся ім: «Дык ганарыся мной і валасы мае / Ты зычліва вянком, Мэльпамэна, спаві» [23, с. 42].

Як зважае Л. Баршчэўскі: «Андрэй Хадановіч не баіцца ў перакладзе паспаборнічаць і з самім Максімам Багдановічам. Гэтак, ён зрабіў другі пасьля нашага клясыка паэзіі пераклад з лаціны оды Гарацыя «Да Мэльпамэны» (у Багдановічавым перакладзе – «Памятнік»). Мушу сказаць, што пераклад

Андрэя ў сваёй паэтычнасьці наўрад ці прайграе клясычнаму. У Хадановіча, відаць, больш дакладна перададзены Гарацыевы выразы «*aere perennius*» – «трывале́йшы за медзь» (хоць націск у слове *трывалейшы* выклікае сумнеў), «*innumerabilis*| *annorum series*» – «ані бясконцы бег / Незьлічоных гадоў», «*qua violens* | *obstrepit Aufidus* | *et qua pauper aquae*| *Daunus agrestium*| *regnavit populor(um)*» – «дзе ў бязводным краі стэпавым людам Даўн / Валадарыў, дзе мчыць воды свае Аўфід» (хоць інвэрсія тут крыху парушае дасканаласьць паэтычнае вымовы). Што праўда, у новым перакладзе ёсьць і страты: маю на ўвазе інтэрпрэтацыі такіх Гарацыевых выразаў, як «*aquilo impotens*», «*vitabit Libitin(am)*», «*usque ego postera* | *crescam laude recens*». Зрэшты, пра свае цяжкасьці пры перакладзе гэтага верша Андрэй Хадановіч сам распавёў у 45-м выпуску «Крыніцы», пары яе квітненьня» [3].

У А. Хадановіча ёсць таксама верш «Насьледванне Гарацыю» (5–6 лютага 1998 года ў цягніку Варшава – Берасце, пасля – на берасцейскім вакзале), якому папярэднічае эпіграф («Exegi monument(um)...». Гэты твор адрозніваецца ад перакладу А. Хадановіча нестандартнай інтэрпрэтацыяй тэмы «неўміручай славы паэта». Паэт пераймае тэму оды Гарацыя і, нават, некаторыя словы. Першыя радкі верша амаль супадаюць з радкамі твора Гарацыя. Паэт сам абвяшчае пра пастаўлены сабе помнік, але ва ўсім гэтым прысутнічае гумар:

Я помнік ладжу ў кшталце манускрыпта.
Не знішчыць сцежку да яго дзірван!
Я фін паміж пяскоў зямлі Егіпта,
паміж калмыкаў – горды ўнук славян! [22, с. 42].

Аўтар звяртаецца да перакладу оды А. Пушкіным. Ён выкарыстоўвае амаль тыя ж самыя словы, называе сябе фінам і ўзгадвае калмыкаў: «и гордый внук славян, и финн, и ныне дикой / Тунгус, и друг степей калмык». А. Хадановіч гаворыць пра неўміручую славу паэта, але робіць гэта з іроніяй. Паэт кажа, што «няма нічога больш горшага, чым пісьменнік, які сам навязвае сябе народу»:

Няхай паўзуць па Беларусі чуткі,
што помнік маю, як і маю мець:
не чэляс, пругкі і зусім не гнуткі
(з ім побач Аляксандраў слуп – малюткі!),
не біцэпсы трывалыя, як медзь,

не кудзеры, не вочы і не персі –
штось іншае дае натхненне рух!
Не! Толькі дух мяне трымае ўверсе,
магутны дух, непераможны дух! [22, с. 42].

Паэт параўноўвае свой «помнік» з «Аляксандравым слупам», як зрабіў гэта А. Пушкін: «Вознесся выше он главою непокорной / Александрийского столпа». «Помнік» А. Хадановіча, як і помнікі многіх іншых паэтаў, якія рабілі пераклады і пералажэнні оды Гарацыя «Да Мельпамены», з'яўляецца самым магутным і вечным. Паэт упэўнены, што яго будуць помніць і шанаваць усе. Ён узгадвае паляшука, каларадскага жука, як неад'емную частку сваёй краіны, без якіх ён не можа ўявіць Беларусь:

Пазнае й будзе шанаваць: вяліка-
й малацьвін, белацьвін і дзікі
габрай, балотаў сябра – паляшук,
і сябра бульбы – каларадскі жук,
дзяўчаткі з Каўнаса, дзяўчаткі з Коўна,
ад Брэста аж да Берасця жанкі! [22, с. 42].

Адчуваецца, што слава А. Хадановіча – гэта толькі чуткі, якія распаўсюджваюцца пра яго на зямлі сярод усяго жывога. Ён, як і Гарацый, адзначае месцы будучай славы: «з Каўнаса», «з Коўна», «ад Брэста», «да Берасця», малюючы тым самым пэўную геаграфічную зону сваёй славы.

А. Хадановіч называе сябе не чалавекам, а «сучасным мітам», адзначаючы гэтымі словамі, што ён яшчэ пры жыцці ўжо стаў міфам, які ніколі «ніхто з палякаў, рускіх альбо немцаў» не кране. Такім чынам, паэт хоча падкрэсліць сваю бессмяротную славу на Беларусі. У канцы верша паэт зноў звяртае: «Мяне чакае ўдзячнасць спадкаемцаў, / вас – вечныя ўспаміны пра мяне!» [22, с. 42]. Аўтар падкрэслівае сваю знакамітасць, як асобы паэта, а не сваіх твораў. Ён унікальны, і больш такога няма. З аднаго боку, А. Хадановіч гаворыць пра неўміручую славу паэта, як і папярэднія аўтары, але робіць гэта з іроніяй. Такім чынам, яго верш успрымаецца па-новаму і займае асобнае месца сярод варыяцый на тэму оды Гарацыя «Да Мельпамены».

Даволі цікавы падыход да пераасэнсавання оды Гарацыя адчуваецца ў вершы С. Мінскевіча «Помнік з гукавым афармленнем». Гэты твор мае два эпіграфы, адзін з якіх належыць В. Булгакаву («Акунуўшы мазгі ў ацэтон / Я пяю і сьпяваю пра...»), другі – А. Пушкіну («Узладзіў помнік я сабе нерукачынны»):

Там дзе
шумны пращпэкт
да пляцу прыходзіць
і тоўсты асфальт
не разбураць
люду тысячы пятак
завяжу я свой погляд
на вузел
марскі
і ногі шырэй расстаўлю
гэтак мушу стаяць пакуль… покуль…
чорт што там далей
пакуль мусіць ня здохну
ці страўнік хрыбта не абдыме
гэтак маю стаяць
буду раўці
аб нечым… пра… пра…
чорт што там далей…
аб нечым мабыць сьмешна-
жалобным
вось люд той ня пяткай
узгадае калі-нікалі
што нехта… што хтосьці…
чорт што там далей…
што нехта здаецца стаяў і хрыпеў
як помнік з гукавым афармленьнем [22, с. 80].

У Смаленску С. Мінскевіча ўразіла, што разам з помнікам стаяў «нябачны» прайгравальнік, таму здавалася, што вяшчае «статуя». Складваецца такое ўражанне, што лірычны герой С. Мінскевіча не можа сабрацца з думкамі, таму што яму перашкаджае гэта нябачнае вяшчанне. Як сцвярджае А. Хадановіч: «Заканамерны крок на шляху ўцелаўленьня ўласнага помніка робіць беларускі літаратар Серж Мінскевіч у сваім тэксьце, што апэлюе на столькі да гарацыеўскага першаўзору, колькі да пушкінскага твору, значна бліжэйшага да нас у часе й культурнай прасторы. У Сержавым опусе недвухсэнсоўна сьцвярджаецца: помніка, які б існаваў асобна ад свайго аўтара, наагул няма й быць ня можа. Літаратар, што жыве на мяжы тысячагодзьдзяў, не такі наіўны, каб не ўсведамляць, наколькі змяніўся статус творцы ў чалавечым грамадзтве за апошнія сто пяцьдзесят гадоў. Паэзія як занятак сталася нашмат меней прэстыжнаю, і ўпэўненасць сучаснага лирыка ва ўласнай несмяротнасці выглядала б ці то як іранічная наіўнасць, ці то як парадыйная гульня ў Гарацыя» [22, с. 80].

Варта адзначыць, што менавіта С. Мінскевічу належыць адзіны беларускі эквірытмічны пераклад славутага верша А. Міцкевіча (1798–1855) «Exegi munimentum aere perennius…». Твор быў напісаны на тры гады раней «Помніка» А. Пушкіна, у Парыже (12 сакавіка 1833 г.). Назва верша А. Міцкевіча – гэта жартаўлівая парафраза пачатку вядомай оды рымскага паэта Гарацыя «Exegi monumentum aere perennius…». Падставай для напісання твора, як заўважае ў прыпісцы сам аўтар, была сустрэча з варшаўскім літаратарам Францішкам Гжымайлам, які апублікаваў у сваім часопісе «Астрэя» першую рэцэнзію на творы А. Міцкевіча. У некаторых выданнях верш «Exegi munimentum aere perennius…» мае другі варыянт назвы – «Візіт пана Францішка Гжымайлы».

Помнік мой пераўжыць мае красу Пулаў[22],
Склеп Касцюшкі[23] і гмах, што ў Вільні Пац[24] узняў,
І не змогуць яго Вінтэжрберг[25] разбамбіць

[22] Гаворка ідзе пра палац у Пулавах, славутую рэзідэнцыю князёў Чартарыйскіх, якая з канца XVIII ст. і па 1830 г. Была культурным асяродкам магнацкіх колаў.
[23] Маецца на ўвазе Вавель, замак у Кракаве.
[24] Гаворка ідзе пра багаты палац заможнага беларускага магната Антонія Міхала Паца, пабудаваны ў сярэдзіне XVIII ст.

І свіння аўстрыяк штукай нямецкай зрыць.
Ад Панарскіх вяршынь ды блізкіх Коўну вод
Славай перасягну Прыпяцкі мост і брод.
Навагародак і Менск рады чытаць верш мой,
Перапіша радкі моладзь сваёй парой,
І ў дачок ахмістрынь мой будзе ў ласцы твор.
З браку лепшых мяне нават чытацьме двор!
Але ж паўз царскі гнеў[26], турмы й ляскат дзвярэй
Возіць тайна ў Літву кнігі мае габрэй. [8, с. 653]

«Помнік» у шматлікіх творах на гэтую тэму падхоплівае ў Гарацыя яго вечнае жыццё, непадуладнае прыродным стыхіям і хуткаплыннасці часу, але ў вершы А. Міцкевіча мы гэтага не знаходзім. Калі для ўсіх паэтычных прыкладаў абавязковы матыў суцяшэння, які выражаецца сцвярджальнай формулай «увесь я не памру», то матыў паэтычнай заслугі і аўтабіяграфічны матыў разгортваюцца часцей за ўсё ў цэнтральнай частцы твора і маюць месца жанравыя прыкметы ўрачыстага плачу; энкомія і эпітафіі (аўтаэпітафіі) таксама істотна вар'іруюцца ў розных «Помніках». Так, малітвенны зварот у фінальнай частцы «Помніка», які стаў, па сутнасці, кананічным, адсутнічае ў вершы А. Міцкевіча.

Як адзначае Дз. Лебядзевіч у артыкуле «Антычная рэцэпцыя ў паэзіі Адама Міцкевіча і Яна Чачота (на матэрыяле беларускіх перакладаў)», што «звяртаецца Адам Міцкевіч і да паэтычнай спадчыны старажытнарымскага паэта Гарацыя, якому лірычная паэзія ў поўнай меры абавязана тым, што ён упершыню перасадзіў яе з грэчаскай роднай глебы на рымскую. Тое, што менавіта эалійскую лірыку Гарацый выбраў узорам, не было выпадковасцю. Архілох, Алкей і Сапфо яшчэ пры жыцці сталі прадметам усеагульнага захаплення. Да архаічнай паэзіі Старажытнай Грэцыі Гарацыя прыцягвала сама прырода яго асабістага даравання, паэтычная роднасць душ. І аб чым марыў старажытнарымскі паэт, тое перавысіла яго спадзяванні. Ён прарочыў сабе славу толькі ў Італіі, ды і то ў абмежваным часе існавання Старажытнага Рыма; а здарылася так, што аб ім даведаўся ўвесь свет. І праз кардоны часу для вялікага сусветнавядомага паэта Адама Міцкевіча служыць прароцтва Гарацыя… Адам Міцкевіч знарок надае свайму твору крыху жартаўлівае адценне. Але далей у вершы праходзіць думка аб вечнасці паэзіі, адчуваецца гонар паэта за сваю творчасць» [15].

Адным з апошніх па часе з'яўлення (2012 г.) – пераклад А.Ф. Брыля, у якім дакладна перадаецца памер арыгінальнага тэксту:

Помнік я збудаваў: стойкі над бронзу ён,
А вяршыня ўзрасла над пірамідаў высь;
І ні сівер ліхі, ні ўсепажэрны дождж
Не разбураць яго, ні чарада гадоў
Незлічоных ды бег часу няўпыннага.
Не, памру я не ўвесь: частку найлепшую
Не здабудзе труна. Буду расці хвалой
Век, пакуль на стары схіл Капітолія
Ходзіць першасвятар з дзевай маўкліваю.
Скажуць там, дзе шуміць А́ўфід раз'юшаны,
Там, дзе колісь царом бедны вадою Даўн
Люду грубаму быў: з нізкіх узнесены,
Першым я пакарыў слову Італіі
Эалійскі напеў. Годнасцю гэтаю
Ганарыся ды мне голаў з ухвалаю,
Мельпамэна, вянчай дэльфскімі лаўрамі! [6]

Але ў адрозненні ад М. Багдановіча і А. Хадановіча, якія абралі варыянт перакладу «aere» – «медзь», А.Ф. Брыль ужыў другое раўнапраўнае значэнне слова «aere» – «бронза». І, калі ў перакладзе М. Багдановіча і А. Хадановіча выкарыстоўваюцца формы вышэйшай ступені прыметнікаў «лепшы медзі», «болей усіх пірамід царскіх» і «трывалейшы за медзь», «высачэйшы за высь велічных пірамід», то ступень параўнання не выражаецца ў перакладзе А.Ф. Брыля апісальнай формай, у аснову якой пакладзена параўнанне: «стойкі над бронзу ён» і «А вяршыня ўзрасла над пірамідаў высь». Але толькі А.Ф. Брыль пры перакладзе трэцяга радка Гарацыя захоўвае азначэнні назоўнікаў – «І ні сівер **ліхі**, ні

[25] Князь Адам Віртэмбергскі, сын нямецкага князя і Марыі з Чартарыйскіх. Як афіцэр царскай службы бамбардзіраваў Пулавы ў час Лістападаўскага паўстання.
[26] Кнігі А. Міцкевіча пасля Лістападаўскага паўстання былі забаронены ў Расійскай імперыі.

**ўсепажэрны** дождж», у варыянце А. Хадановіча прыметнікі, якія ёсць у тэксце Гарацыя, – адсутнічаюць «Ні навалы залеў, ні Аквілёна моц», М. Багдановіч апускае ў гэтым радку азначэнне да слова «сівер», а слова «дождж» аздабляе прыметнікам «едкі», які мае не ярка выяўленае значэнне, і, канешне, саступае значэнню «**ўсепажэрны**», што ў варыянце А.Ф. Брыля.

Дарэчы, у арыгінале прыметнік multa (que pars mei) ужываецца ў станоўчай ступені, у адрозненні ад варыянтаў М. Багдановіча «Не саўсім я памру, **лепшая** часць мяне» [8, с. 43], А.Ф. Брыля «Не, памру я не ўвесь: частку **найлепшую**» [6] і А. Хадановіча «**Лепшае**, што ўва мне…» [23, с. 42].

У апошніх радках твора паэты звяртаюцца да Мельпамены: у гэтым поўнасцю прытрымліваюцца арыгінальнага тэксту А. Хадановіч (які апускае пры перакладзе прыметнік «дэльфійскі») і А.Ф. Брыль (выкарыстоўвае множны лік «дэльфійскімі лаўрамі» замест адзіночнага), а вось М. Багдановіч звяртаецца проста да музы, якую просіць пакрыць валасы лаўровым вянком, не выкарастоўваючы прыметнік «дэльфійскі»: «Ўсе заслугі мае, муза, з пашанай зліг / І лаўровым вянком мне валасы пакрой» [8, с. 43].

**Заключэнне**. Праблема творчасці, яе прызначэння і самакаштоўнасці хвалявалі і хвалююць многіх паэтаў. Менавіта таму, яны звяртаюцца да тэмы «неўміручай славы паэта», якая ўпершыню развіваецца ў творчасці рымскага паэта Гарацыя ў одзе «Да Мельпамены» (*Ad Melpomĕnem*, III, 30), набывае сусветна-гістарычнае значэнне і на працягу многіх стагоддзяў застаецца ўзорна-паказальнай для паэтаў розных пакаленняў. Айчынныя паэты ўпэўнены ў неабходнасці засваення не толькі нацыяльных традыцый, але і багатага вопыту антычнай літаратуры. У беларускім кантэксце тэма «Помніка» набывае спецыфічныя нацыянальныя характарыстыкі. Духоўная актыўнасць нацыі, яе шырокае жаданне быць падключанай да агульначалавечага культурнага вопыту ажыццяўлялася як праз непасрэдны зварот да канкрэтных тэм, так і пры дапамозе мастацкага перакладу твора Гарацыя. Бела-рускімі аўтарамі былі створаны пераклады оды Гарацыя «Да Мельпамены» (М. Багдановіч, А. Хадановіч, А.Ф. Брыль), пераклады-пералажэнні (У. Жылка «Прыкладзіны»), пералажэнні-пародыі (А. Хадановіч «Насьледванне Гарацыю», С. Мінскевіч «Помнік з гукавым афармленнем»).

ЛІТАРАТУРА

1. Баршчэўскі, Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму : папуляр. нарысы / Л. Баршчэўскі. – Мінск : Сэр-Віт, 2003. – 512 с.
2. Баршчэўскі, Л. Літаратура Стражытнага Рыма / Л. Баршчэўскі // Роднае слова. – № 9. – 1995. – С. 100–115.
3. Баршчэўскі, Л. У Бадлеравым абліччы / Л. Баршчэўскі // ARCHE. – № 3 (2003). – 2002. – С. 75–80. – Рэжым доступа: http://arche.bymedia.net/2002-3/barsz302.html. – Дата доступа: 14.07.2015.
4. Барысюк, Т. П. Пошукі бессмяротнасці ў паэзіі І. Бродскага і У. Караткевіча / Т. П. Барысюк // «Мова – Літаратура – Культура» : матэрыялы VI Міжнар. навук. канф., Мінск, 28–29 кастр. 2010 г. – Мінск : БДУ, 2010. – С. 196–200.
5. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: выбраныя тэксты для чытання і аналізу / уклад. Л. Баршчэўскі. – Мінск, Радыёла-плюс, 2006. – 496 с.
6. Брыль, А. Ф. Квінт Гарацый Флак. Легкадумны заўсёды я. Выбраныя оды / А.Ф. Брыль. – Рэжым доступа: http://prajdzisvet.org/kit/108-liehkadumny-zausiody-ja.html. – Дата доступа: 20.04.2015.
7. Вергилий. Буколики. Георгики. Энеида / пер. С. Шервинского и С. Ошерова. – М. : Худ. лит-ра, 1971. – 418 с.
8. Галасы з-за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX ст. / склад. М. Скобла ; уступны артыкул Е. Лявонавай, навук. рэд. Л. Баршчэўскі. – Мінск : Лімарыус, 2008. – 896 с.
9. Гарацый. Ода II, 20; Ода III, 30 / пер. А. Хадановіча і С. Карчыцкага // Annus Albaruthenicus-2001. – Крынкі, 2001.
10. Герцык, А. В. Вывучэнне «Іліяды» Гамера і лірыкі Гарацыя ў X класе / А. В. Герцык. – Беларуская мова і літаратура. – № 1. – 1998. – С. 60–68.
11. Гораций Флакк К. Оды, эподы, сатиры, послания / пер. под ред. М. Л. Гаспарова. – М. : Худ. лит-ра, 1970. – 470 с.
12. Жылка, Ул. Выбраныя творы / укладанне, прадмовы і камент. М. Скоблы. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 358 с.
13. Казыра, Л. Перакладчыцкая спадчына Максіма Багдановіча // М. Багдановіч. Поўны збор твораў : у 3 т. Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991.– Т. 1.– С. 540–563.
14. Катулл. Тибулл. Проперций / Катулл, Тибулл, Проперций. – М. : Худ. лит-ра, 1963. – 454 с.
15. Лебядзевіч, Дз. Антычная рэцэпцыя ў паэзіі Адама Міцкевіча і Яна Чачота (на матэрыяле беларускіх перакладаў) / Дз. Лебядзевіч. – Рэжым доступа: http://www.elib.grsu.by/katalog/146963-293497.pdf. – Дата доступа 16.07.2015.
16. Лебядзевіч, Дз.М. Антычныя традыцыі ў беларускай літаратуры XIX – пач. XX стагоддзя / Дз.М. Лебядзевіч. – Брэст, 1997. – 24 с.
17. Мартысевіч, М. «Антычны код» сучаснага беларускага верша / М. Мартысевіч // Роднае слова. – 2008. – №5. – С. 7–11.
18. Овидий. Собрание сочинений / Овидий. – СПб.: Студиа Биографика, 1994. – Т. II. – 528 с.
19. Рагойша, В.П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапаможнік / В.П. Рагойша. – Мінск : Бел. энцыкл., 2001. – 384 с.

20. Расстраляная літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі, прадм. А. Сідарэвіча, камент. М. Скоблы, К. Цвіркі. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – С. 456.
21. Філаматы і філарэты : зб. / уклад., пер. польскамоўных твораў, прадм., біяграфічныя даведкі пра аўтараў і каментарыі К. Цвіркі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 400 с.
22. Хадановіч, А. «Засьпетыя на Гарацым. Тры стратэгіі будаўніцтва «Помнікаў» (Пушкін, Міцкевіч, Бадлер ды іншыя)» / А. Хадановіч // Arche-Skaryna. – 2001. – № 3 (17). – С. 73–84.
23. Хадановіч, А. Насьледванне Гарацыю // А. Хадановіч. Ноч салідарнасці // Крыніца. – 1998. – № 10. – С. 38–43.
24. Хадановіч, А. Разам з пылам: калекцыя перакладаў / А. Хадановіч. – Мінск : Кнігазбор, 2013. – 200 с.
25. Хадановіч, А. Эпоха Вялікай Рэтардацыі, альбо Беларуская паэзія заўтра / А. Хадановіч // Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня. – СПб. : Невский простор, – 2003. – 496 с. – Рэжым доступа: http://kamunikat.fontel.net/www/knizki/hramadztva/myslennie/31.htm. – Дата доступа 16.07.2015.
26. Чабан, Т. Космас «Вянка». Літаратурны каментарый да «Вянка» Максіма Багдановіча // Багдановіч М. Поўны збор твораў : у 3 т. Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.– Мінск : Навука і тэхніка, 1991.– Т. 1.– С. 463–518.

*Пастуліў 17.12.2015*

## «MONUMENT» BY HORACE AS A PHENOMENON OF BELARUSIAN LITERATURE

***N. NESTER***

*Ode by Horace «To Melpomene» (Ad Melpomĕnem) in the history of Belarusian literature – a phenomenon at the same time familiar and insufficiently studied so far is of interest to literary critics. This work of Horace marked the beginning of a new poetic genre – «Monument», in which he partially take the basis of the composition odes by Horace and its first line «Exegi monumentum aere perennius», tells the story of their merits before poetry and innovation, which should be kept in his descendants and immortalize name. But among other poems-«Monuments» in the Roman literature, it is an ode by Horace has copyright individualism and comprehension of his «personal» poetic immortality, it developed the motif of poetic competition «monument» to historical (pyramid) and natural (Elemental) sometimes with eternity. This theme has become common place many «Monuments», each next version of this genre form begins to compete with the previous one, and thus indirectly – and with Horace. Studied the works by M. Bogdanovich, U. Zylka, A. Hadanovich, S. Minskevich, A. Mickiewicz, A.F. Bryl. It's noted that the domestic poets refer to «Monument» Horace, create translations, translations-transcription, transcription-parody,that in the Belarusian contex, «Monument» theme takes on specific national characteristics.*

***Keywords:*** *monument, Melpomene, translation, interpretation, variation, parody, irony, reconsideration, transformation.*